**В. М. СІДАРОВІЧ**
***(Мінск, Беларусь)***

# УНІКАЛЬНЫ РЫЖСКІ ТРАЯК СТЭФАНА БАТОРЫЯ ЧАКАНКІ 1581 г. СА ЗБОРУ НУМІЗМАТЫЧНАГА КАБІНЕТА БДУ

Пад час навуковай інвентарызацыі фондавых калекцый Нумізматычнага кабінета БДУ быў выяўлены трохграшовік Стэфана Баторыя чаканкі Рыжскага манетнага двара, аналагі якога не прадстаўлены ў аніводным з аўтарытэтных каталогаў.

Спосаб паступлення манеты ў калекцыю невядомы. Можна меркаваць толькі, што яна не належыць да якога-небудзь скарба і паступіла не пазней за канец 1970-х гг.

Апісанне манеты: Ав.: Пагрудная выява Стэфана Баторыя, управа. Кругавая легенда •STEP•D•G•RE (III) X•PO•M•DL• падзелена ўнізе наміналам «III» у авальнай абводцы, а ўверсе — каронаю; Рэв.: •»Арол» — «Пагоня»• / GROS•ARG / TRIP•CIVI / RIG ЕИ / •8 малы герб Рыгі 1•

Мар’ян Гумоўскі дае апісанне падобнай манеты (Gumowski, 1914, № 1581), але ў адрозненне ад нашага экзэмпляра намінал «III» пададзены ў аздобнай, г. зн. фігурнай абводцы. У экзэмпляра з НК БДУ абводка авальная. Януш Курпеўскі таксама дае такі ж, як М. Гумоўскі, варыянт, называючы яго унікатам (Kurpiewski, 1994, № 440).

Аверс манеты выкананы ў «віленскім» стылі. Манеты з падобным аверсам чаканіліся на Віленскім манетным двары ў 1580 і 1581 гг., але поўных адпаведнікаў няма. Схема размяшчэння легенды рэверса таксама адпавядае хутчэй віленскім траякам, чым «класічным» рыжскім трохграшовікам. Звычайным для віленскіх траякоў 1580–1581 гг. з’яўляецца і размяшчэнне ўверсе рэверса гербаў (без намінала), у т. л. з кропкамі па баках (гл. Iger: V.80.3, V.80.5, V.81.1). На рыжскіх траяках гербы Рэчы Паспалітай увогуле адсутнічаюць, таксама як і малы герб Рыгі.

Можна выказаць некалькі версій па інтэпрэтацыі гэтай манеты. Па першай з іх, траяк з’яўляецца пробнай манетай, якая была адчаканена на гарадскім манетным двары Рыгі на самым пачатку яго дзейнасці, як аднаго з эмісійных цэнтраў РП. За ўзор для яе былі ўзятыя, хутчэй за ўсё, траякі Віленскага манетнага двара. Па другой версіі, гэтая манета — антыкварная падробка XIX ст. Нельга выключаць і варыянт імітацыі Новага часу.

*Gumowski M. Podręcznik numizmatyki polskiej. Kraków, 1914*
*Iger T. Katalog trojaków polskich. Warszawa, 2008*
*Kurpiewski J. Katalog monet polskich 1576-1586 (Stefan Batory). Warszawa, 1994.*